# Беларусы не разумелі, у імя якіх каштоўнасцей яны павінны былі пакутаваць

## Размова з
## Алегам Манаевым



Калі Лукашэнка прыйшоў да ўлады, мы пісалі пра яго, што гэта прэзідэнт бедных, няшчасных і ашуканых беларусаў. Адным словам, Робін Гуд, і насамрэч так было некалькі гадоў. А цяпер гэта таксама прэзідэнт новых, дынамічных грамадскіх груп. Гэта яго электарат і яго інтарэсы Лукашэнка рэалізуе.

## Якія былі вынікі хуткай індустрыялізацыі і ўрбанізацыі Беларусі пасля ІІ сусветнай вайны?

Гэтыя працэсы адбываліся ў Беларусі надзвычай хуткімі тэмпамі. Гэта не было звычайнае развіццё прамысловасці і грамадства, якое адбывалася ва ўсім свеце. Калі ў палове 70-х гадоў я пачынаў працу сацыёлага, мае настаўнікі, творцы беларускай сацыялогіі даказвалі, што ў той час толькі адзін горад у свеце параўноўваўся з Менскам па тэмпе ўрбанізацыі —Мехіка.

Тэмп развіцця беларускіх гарадоў быў шалёным. Пасля 1945 года сацыяльная структура ў гарадах вельмі змянілася. Да вайны каля 70 працэнтаў людзей жыло ў вёсцы, а 30 працэнтаў у горадзе. Пасля вайны гэтыя прапорцыі памяняліся месцамі. Так было, таму што падчас вайны загінуў кожны трэці беларус, але трэба памятаць, што ў значнай частцы гэта былі габрэі, якія жылі ў гарадах. Да 1941 года на беларускіх землях жыло звыш мільёна габрэяў. Цяпер іх няпоўныя трыццаць тысяч. Вялікая колькасць загінула падчас акупацыі, але многія габрэі былі вымушаны выехаць у пазнейшыя дзесяцігоддзі. А габрэі былі важным элементам беларускай культуры, садзейнічалі эканамічнаму і культурнаму развіццю краіны. Калі ў 1970-80 гадах з Беларусі выехала каля чвэрці мільёна габрэяў, гэта была цяжкая страта для нас. Пасля вайны, каб запоўніць дзіркі, што ўзніклі ў выніку Халакосту, прывозілі спецыялістаў з Расіі. Звозілі сотні тысяч людзей, якія адбудоўвалі краіны. Будавалі гарады, фабрыкі, займалі кіруючыя пасады. Прыязджалі людзі з Уралу, з Сібіры. Яны хацелі распачаць у Беларусі новае жыццё. Гэтая маса людзей прывяла да дэнацыяналізацыі беларускага грамадства. Прышлыя з іншых краін прынеслі з сабой таксама іншыя традыцыі і іншыя погляды на грамадства, на дзяржаву, на публічнае і сямейнае жыццё.

## Якое было стаўленне да тагачаснай Беларускай савецкай рэспублікі? Яе лічылі часовым месцам для жыцця ці хацелі запусціць тут карані?

На Берасцейшчыне сёння жыве шмат былых ваенных розных нацыянальнасцей. У часы СССР там часова размяшчаліся савецкія войскі і пасля распаду Саюза гэтыя людзі па-просту засталіся на гэтай зямлі. Для іх Беларусь аказалася месцам цалкам камфортнага жыц-

ця. Яе часта выбіралі як месца для пенсіі, бо гэта была ціхая і спакойная рэспубліка. Але ж людзі, якія сюды прыязджалі, не пераймалі беларускіх культурных традыцый.

## Ці гэтая дэнацыяналізацыя грамадства зрабіла так, што Беларусь была рэспублікай без дысідэнтаў?

Пасля вайны людзі насамрэч не супраціўляліся сістэме, якая ўзнікла. Гэта звязана з працэсамі, пра якія мы гаворым. Таму Беларусь зусім нельга параўноўваць з Польшчай 50-х, 60-х і 70-х гадоў, дзе супраціў быў непараўнальна большы. Таксама, у параўнанні з Украінай, Расіяй і балтыйскімі краінамі, апазіцыя ў Беларусі амаль не існавала.

## Як грамадзяне Беларусі адрэагавалі на распад СССР?

У 1991 годзе ў Беларусі запанавала эйфарыя, звязаная з прыходам "новага". Людзі былі змучаныя мінулым, савецкім хаосам. Ім ужо надакучыла і гнілая ідэалогія, якая ўжо не была такой пануючай, і эканамічны крызіс. Дзесяткі тысяч людзей літаральна жылі тады ў цягніках: вывозілі розныя тавары ў Польшчу, каб мець грошы, і выкуплялі ў польскіх крамах усё, чаго тады не было ў нас. Тады народы СССР у большасці лічылі, што падзенне камунізму і выхад на незалежнасць — гэта пазітыўны факт. Калі распад імперыі не ўспрымаўся б пазітыўна, то маскоўскі путч скончыўся б поспехам і ўвогуле не дайшло б да белавежскіх пагадненняў.

Беларусь не была выключэннем. Аднак націск трэба зрабіць на ступень і глыбіню задаволенасці з факту атрымання незалежнасці. На пачатку 90-х гадоў балтыйскія краіны, падобна як раней Польшча і Чэхія, з радасцю віталі падзенне камунізму і пачалі рэалізоўваць нацыянальныя праграмы: увядзенне дэмакратыі і рыначнай эканомікі. Гэтыя краіны мелі мэту: стаць часткай аб'яднанай Еўропы, увайсці ў структуры Еўрапейскага Саюза і НАТА. А для Беларусі гэта не было прыярытэтам, таму гэты пачатковы аптымізм хутка пачаў праходзіць, асабліва калі наступіў крызіс пачатку 90-х гадоў. У 1992 і 1993 гадах заробкі складалі 25 долараў у месяц, а цэны раслі. Балтыйскія краіны таксама змагаліся з эканамічнымі праблемамі, але тым народам дапамагала выжыць свядомасць таго, што трэба дасягнуць тых мэтаў, пра

якія я казаў вышэй. У нас жа не пачаў дзейнічаць механізм кампенсацыі і беларусы не разумелі, у імя якіх каштоўнасцей павінны былі пакутаваць. Яны адчулі сябе расчараванымі і ў той жа момант засумавалі па Савецкім Саюзе. Не па СССР у той форме, у якой ён існаваў, але за нечым падобным. Смутак па СССР гэта de facto смутак па дзяржаве, якой ніколі не было.

**А як ставіліся да новай дзяржавы тыя грамадзяне Беларусі, якія прыбылі сюды з іншых рэгіёнаў Савецкага Саюза? Бо адна справа - жыць на пенсіі ў аддаленай частцы той самай дзяржавы, і зусім іншая - раптам апынуцца ў цалкам іншай краіне. Вы самі паходзіце з Уладзівастоку.**

Людзей, якія ў Беларусь прыехалі з Расіі і з тых найбольш аддаленых краёў СССР, сёння насамрэч шмат. Умовы, у якіх нам давялося жыць у гэтай дзяржаве, былі цалкам нармальнымі і нашы погляды нічым такім не розніліся ад поглядаў беларусаў, якія жылі тут спрадвеку. Можа, на гэта моцна не ўплывае месца нараджэння і этнічнае паходжанне, гэта хутчэй пытанне адукацыі, поглядаў і выхавання.

Нацыянальныя дзеячы сцвярджаюць, напрыклад, што беларусы, якія карыстаюцца беларускай мовай - гэта дэмакраты, прыхільнікі рынкавай эканомікі, яны хочуць перамен, а ў той час жыхары Беларусі, якія размаўляюць па-руску — гэта пятая калона і прыхільнікі Лукашэнкі. Маюць рацыю, калі кажуць, што сучасная ўлада русіфікуе грамадства, але тэзіс, што беларускамоўная частка грамадства выказваецца за дэмакратыю і Захад — не адпавядае праўдзе.

Пятнаццаць год мы праводзім даследаванні, у якіх задаём пытанне: “Якой мовай Вы карыстаецеся наштодзень?” Аказваецца, што па-беларуску гаворыць 6,8 працэнта, па-руску 56,7 працэнта, абедзвюма мовамі карыстаецца 16,6 працэнта, а трасянку штодзень ужывае 19 працэнтаў. Лічбы змяняюцца, калі пытаем: “Якую мову вы лічыце роднай?” За такую беларускую мову выказваецца 29,4 працэнты рэспандэнтаў, за рускую 36,8 працэнты, а 31,2 працэнты сцвярджаюць, што і беларуская і руская іх родныя мовы.

Гэтыя лічбы кажуць значна больш, калі супаставім іх з адказамі на пытанне пра інтэграцыю з Еўрапейскім Саюзам ці з Расіяй. Аказваецца, што якраз людзі, якія штодзень карыстаюцца беларускай мовай, вы-

казваюцца за інтэграцыю з Расіяй і падтрымліваюць Лукашэнку, і выступаюць супраць дэмакратыі і рынкавай эканомікі. Пра гэта вырашае, канешне, не мова, а дэмаграфія. Па-беларуску размаўляе старая і неадукаваная вёска, тая, якая падтрымлівае Лукашэнку і сумуе па СССР. Канешне, за гады незалежнасці з'явілася багата беларускамоўнай моладзі, якая пратэставала ў сакавіку 2006 года і якая звязаная з апазіцыяй. Але ў першай групе людзей сотні тысяч, можа нават мільён, а беларускамоўнай і апазіцыйнай моладзі — тысячы. Лічбы кажуць самі за сябе. На жаль, у нас ёсць пісьменнікі, якія, бачаць, як мала людзей карыстаецца беларускай мовай і кажуць: "Такі беларускі народ нам непатрэбны". Але гэта тэзіс Адольфа Гітлера...

## Вернемся яшчэ да суму па Савецкім Саюзе. Ці гэта, менавіта, ён перадвырашыў перамогу Лукашэнкі ў 1994 годзе?

Лозунгі, з якімі Лукашэнка ішоў на выбары, зрабілі вялікі фурор. Ён адкінуў нацыянальныя каштоўнасці і падхапіў лозунг вяртання да СССР. Быць можа, не ў такой форме, у якой гэта краіна існавала, але абвяшчаў ідэі саюзнай дзяржавы. Людзі ў той жа момант прынялі гэтыя лозунгі. Лукашэнка перамог з вялізнай перавагай у справядлівых выбарах.

## Ці перамога Лукашэнкі была гістарычна абгрунтаванай?

Яго перамога мела аб'ектыўныя прычыны. Была натуральнай і проста ўпісвалася ў гісторыю Беларусі. З упэўненасцю гэта не была ні памылка, ні капрыз гісторыі. За прыходам гэтага чалавека да ўлады стаялі аб'ектыўныя гістарычныя працэсы і сацыяльныя інтарэсы мільёнаў людзей, а ніякая ні інтрыга з Лубянкі. Інтэрпрэтацыя, што гэта чалавек, якога спецслужбы падкінулі беларусам, спачатку была вельмі папулярнай. Паводле гэтай тэорыі, беларусы хацелі ісці той дарогай, што і Польшча, і балтыйскія рэспублікі, толькі нас падманулі і паслалі нам Лукашэнку. Цяпер мы маем толькі адну праблему: неяк прыбраць гэтага Лукашэнку і вярнуцца на патрэбную нам сцежку. У той жа час сацыёлагі пераконваюць, што Лукашэнка з'яўляецца квінтэсенцыяй беларускасці і не дастаткова яго прыбраць, каб развітацца з праблемамі. Ён дакладна такі, як і беларускае грамадства, а яно, нават пасля яго зняцця з пасады, такім жа і застанецца.

Быць можа, быў шанец пазбегнуць перамогі Лукашэнкі. Аднак гісторыя не прызнае умоўнага ладу, таму цяжка прадказаць, што было б, калі б прэм’ер Вячаслаў Кебіч паводзіў сябе іначай, калі б пазбеглі дзікай прыватызацыі, якая палягала на тым, што дзяржаўная ўласнасць была самым банальным чынам раскрадзеная. Усё гэта адбывалася на вачах людзей. Трэба таксама пашукаць адказу, што было б, калі б дэмакратычныя сілы не былі падзелены на два лагеры: ліберальна-дэмакратычны Шушкевіча і грамадзянска-нацыяналістычны Пазняка. Канешне, нельга забываць таксама пра расійскі фактар і Захад. Расія павінна была б прыняць трошкі іншую стратэгію адносна Беларусі, а Захад больш сур’ёзна глядзець на Беларусь і з большай павагай назіраць за працэсамі, якія адбываліся ў нашай краіне. Тады наша дзяржава выглядала б інакш, але гэтых “калі б” вельмі многа...

**Кім з’яўляюцца людзі, якія сёння галасуюць за Лукашэнку? У 1994 годзе як аксіёма прымалася, што электарат Лукашэнкі будзе выміраць, а тым часам мінула трынаццаць год, а Лукашэнка і надалей карыстаецца вялікай папулярнасцю.**

Падчас апошніх прэзідэнцкіх выбараў, паводле дадзеных незалежных цэнтраў, за Лукашэнку прагаласавала каля 60 працэнтаў выбарцаў, Аляксандра Мілінкевіча падтрымалі 20 працэнтаў. Цвёрды электарат Лукашэнкі за гэтыя гады не змяніўся — гэта дакладна тыя самыя савецкія беларусы. Гэта старэйшыя асобы, пенсіянеры, найчасцей жыхары вёскі, з базавай адукацыяй. У гэтым цвёрдым электараце пераважаюць жанчыны, паколькі жанчыны ў Беларусі жывуць на дзесяць год даўжэй за мужчын. Усе гэтыя людзі залежаць ад дзяржавы.

Аднак на працягу гэтых трынаццаці гадоў, а асабліва на працягу астатніх пяці-шасці, электарат Лукашэнкі папоўнілі новыя групы: гэта людзі маладыя альбо сярэдняга веку, якія працуюць у бюджэтнай сферы. Напрыклад, добра плацяць будаўнікам. Атрымліваюць каля мільёна рублёў - 500 долараў, гэта больш, чым зарабляе прафесар. Таксама і прадстаўнікі прыватнага бізнесу пачалі галасаваць за Лукашэнку. У нашай краіне сфера прыватнага бізнесу спецыфічная. Яна складае адну пятую частку эканомікі. Малы бізнес, гандляры, выступаюць супраць Лукашэнкі, але прадстаўнікі сярэдняга і вялікага — за яго. У Беларусі пры дапамозе дзяржавы можна зрабіць вялікія справы, толькі трэба пагадзіцца на яе прынцыпы гульні. Напрыклад, раённая адміністрацыя

звяртаецца да прадпрымальніка з просьбай, каб знайшоў грошы на будаўніцтва дарогі ці рамонт нейкага будынка, альбо прапануе прыняць на працу нейкага парэкамендаванага чалавека. Потым просіць, каб падчас выбараў не падтрымліваць ніякіх альтэрнатыўных кандыдатаў і не друкаваць рэклам у апазіцыйнай прэсе. Людзі, якія пагаджаюцца на такія просьбы, атрымліваюць ад дзяржавы прэферэнцыі. За астатнія дзесяць год такіх людзей з'явілася ў Беларусі вельмі многа. Размова ідзе пра дзесяткі тысяч.

Ёсць вельмі важная група, армія чыноўнікаў. Афіцыяльныя дадзеныя паказваюць, што ў вертыкалі выканаўчай улады сто дзесяць тысяч людзей, а да гэтага трэба яшчэ дадаць кіраўніцтва вышэйшых школ і пасады гэтага ўзроўню. Людзей, звязаных з сістэмай, і членаў іх сямей каля паловы мільёна. Іх можа не на сто працэнтаў, але ў агульным задавальняе форма дзяржавы Лукашэнкі. Маюць стабільныя заробкі на добрым узроўні, маюць уладу, можа незначную, але такую, якая ім патрэбна. І, што найважнейшае, ведаюць, што іх кар'ера і дабрабыт залежаць толькі ад адной рэчы — ад узаемаадносінаў з чыноўнікамі рангам вышэй. Мэр невялікага горада, які мае добрыя адносіны з губернатарам, зусім не павінен клапаціцца пра рэпутацыю ў сваім горадзе.

## А якую пазіцыю займае моладзь?

Якраз сярод чыноўнікаў вельмі шмат маладых людзей. У цэнтры Менска ёсць будынак Акадэміі кіравання пры прэзідэнце, у якой вучацца супрацоўнікі адміністрацыі. Праходзячы каля гэтага будынка, можна ўбачыць багата маладых і сімпатычных людзей. Яны прыязджаюць у сталіцу з усёй Беларусі, атрымліваюць вялікую стыпендыю, вучацца ў добрых умовах, а пасля маюць гарантаваную добрую працу.

Калі Лукашэнка прыйшоў да ўлады, мы пісалі пра яго, што гэта прэзідэнт бедных, няшчасных і ашуканых беларусаў. Адным словам, Робін Гуд, і, насамрэч, так было некалькі гадоў. А цяпер гэта таксама прэзідэнт новых, дынамічных грамадскіх груп. Гэта яго электарат і яго інтарэсы Лукашэнка рэалізуе.

## Ды мусіць і частка нацыянальнай апазіцыі, хоча ці не хоча, пачала падтрымліваць Лукашэнку як гаранта незалежнасці дзяржавы? Ці не трапілі яны ў свайго тыпу пастку?

Гэта цяжкае і далікатнае пытанне. Многія людзі з дэмакратычных колаў, я маю на ўвазе не толькі палітыкаў, але і журналістаў, аналітыкаў, дзеячоў па правах чалавека, студэнтаў, для якіх найважнейшай каштоўнасцю з'яўляецца нацыянальная, незалежная краіна, раптам зразумелі, што Лукашэнка бароніць гэтую каштоўнасць як ніхто іншы. Першы раз мы маглі бачыць гэта ўлетку 2002 года, калі ў чэрвені Уладзімір Пуцін прамовіў славутае, што трэба аддзяліць "мух ад катлет", а ў жніўні пажадаў, каб Беларусь увайшла ў склад Расіі. Якраз тады некаторыя апазіцыянеры пачалі казаць, што ўжо не маюць прычын для змагання з Лукашэнкам. Для іх незалежнасць з'яўляецца каштоўнасцю большай чым дэмакратыя. Я памятаю журналістаў, якія працавалі ў незалежных медыях і вялі барацьбу з рэжымам, а пасля таго, як Лукашэнка супрацьпаставіўся Расіі, паведамілі, што "прычыны нашага самага вялікага незадавальнення ўжо няма" і пачалі працу ў дзяржаўных медыях. Хтосьці атрымаў працу на дзяржаўным тэлебачанні, хтосьці пачаў працаваць у газеце "Советская Белоруссия".

## Ці змяняюцца адносіны беларусаў да Расіі і да інтэграцыі з ёй?

У гэтым пытанні можна назіраць вялікую дынаміку. Усё папярэдняе дзесяцігоддзе беларускае грамадства дзялілася на дзве няроўныя часткі. Першая канцэнтравалася вакол ліберальных і нацыянальных каштоўнасцей, выказвалася за збліжэнне да Еўропы. Размова тут ідзе пра некалькі сотняў тысяч чалавек — не толькі сябраў апазіцыйных партый. Для гэтай групы Расія асацыявалася з былым СССР і імперыялістычнымі тэндэнцыямі, таму яна падыходзіла да Расіі асцярожна альбо нават неахвотна. Падобна гэтыя людзі ацэньваюць Саюз Беларусі і Расіі.

Але другая, значна большая група, мела зусім іншае стаўленне да Расіі. Расія была для іх мастом, які вёў у мінулае. Саюз Беларусі і Расіі для гэтых людзей быў надзеяй на вяртанне СССР. Падзел быў просты і накладаўся на падтрымку для Лукашэнкі, але ён змяніўся пасля 2000 года, калі да ўлады прыйшоў Пуцін. У 2000-01 гадах прэзідэнт Расіі

актыўна дзейнічаў на міжнароднай арэне, пасля 11 верасня 2001 года стаў падтрымліваць “барацьбу з міжнародным тэрарызмам”, у эканоміцы Расіі таксама пачаліся немалыя змены. Гэта выклікала змену адносінаў беларускага грамадства да Расіі. Многія беларусы з першай групы пачалі звязваць Расію з Захадам і рынкавай эканомікай. У іх уяўленні гэта была дзяржава, якая паказвала праеўрапейскі падыход да міжнародных спраў, а Пуцін здаваўся ім прагрэсіўным палітыкам. Другая група, якая складалася з савецкіх беларусаў, пачала ў сваю чаргу баяцца Расіі, таму гэтыя дзве групы пачалі пастунова мяняцца месцамі.

Да гэтага спрычынілася агрэсіўная палітыка, якую Расія вядзе супраць Беларусі, падымаючы цану нафты і газу. З таго часу сродкі масавай інфармацыі, сістэма адукацыі, культура, царква — усе ўстановы, якія залежаць ад дзяржавы, фармуюць грамадскую думку ў апазіцыі да Расіі. Гэта спрыяе фармаванню нацыянальнай самасвядомасці. За апошні год прарасійскія сімпатыі паменшыліся. Гэта было відаць асабліва пасля таго, як Аляксей Міллер паведаміў, што цана на нафту і газ будзе расці. Ужо 10 гадоў задаём пытанне: “Які варыянт інтэграцыі Расіі і Беларусі Вам асабіста б адпавядаў?” На выбар тры варыянты адказаў. Першы — гэта звыклыя суседскія адносіны, якія ў нас, напрыклад, з Польшчай; другі — гэта стварэнне супольнай дзяржавы і трэці варыянт — Саюз Беларусі і Расіі. Яшчэ дзесяць гадоў таму прыхільнікаў Саюза было больш за палову, а лічба прыхільнікаў супольнай дзяржавы перавышала лічбу прыхільнікаў звычайных суседскіх адносін. Сёння супольную дзяржаву хоча 8 працэнтаў апытаных, а прыхільнікаў Саюза Беларусі і Расіі столькі ж, колькі і прыхільнікаў нармальнага суседства. Такіх дадзеных мы яшчэ ніколі не мелі.

## Як гэта стасуецца з міжнароднай палітыкай Беларусі?

Сімпатыі беларусаў, якія апошнія гады канцэнтраваліся на Расіі, не пераносяцца аўтаматычна на Еўропу, але яны, канешне, дзесьці ёсць. Яны пераўтвараюцца ў самаізаляцыйныя тэндэнцыі. У апошнія гады гэта вельмі адчуваецца. Напрыклад, задаём пытанне: “Калі б сёння праводзілі рэферэндум, якім шляхам павінна пайсці Беларусь, як бы Вы прагаласавалі?”. Ёсць тры варыянты адказаў: саюз з Расіяй, інтэграцыя з Еўрапейскім Саюзам і супраць усялякіх інтэграцый. За першы варыянт прагаласавалі 26 працэнтаў, за другі 22 працэнты, а супраць інтэграцыі з кім бы там ні было 30 працэнтаў. Некалькі гадоў таму гэтая лічба была вельмі малой.

Гэта непакоіць, бо калі ў грамадстве пачынаюць дамінаваць ізаляцыйныя тэндэнцыі, то значыць, што аўтарытарны рэжым атрымлівае дадатковую падтрымку. І, на жаль, дзяржаўны апарат выкарыстоўвае гэтую тэндэнцыю. Блакуе доступ інфармацыі як з Захаду, так і з Расіі, прапануючы грамадству замест гэтага рэалізацыю нейкіх экзатычных, нават геапалітычных рашэнняў, як сяброўства з Венесуэлай, В'етнамам ці Іранам.

У маі 2007 года мы праводзілі апытанне: "Як Вы лічыце, з якой краінай Беларусь павінна мець самыя моцныя сувязі?". На першым месцы і надалей трымаецца Расія, на другім апынуўся Еўрасаюз, на трэцім месцы краіны СНД, а на чацвёртым — Іран, Венесуэла і падобныя ім дзяржавы. Кожны пяты дарослы беларус цалкам сур'ёзна лічыць, што паміж Беларуссю і Іранам могуць існаваць цесныя, партнёрскія адносіны. На пятым месцы знаходзіцца Кітай, потым арабскія краіны і ў самым канцы ЗША.

Дзесяць гадоў таму назад гэтыя дадзеныя выглядалі зусім інакш. Калі б мы размясцілі ў гэтых апытаннях Венесуэлу, Іран і падобныя краіны, большасць людзей увогуле не мелі б паняцця, пра што мы іх пытаем і чаму яны знаходзяцца ў спісе. Зрэшты, і сёння многія беларусы не змогуць паказаць гэтых дзяржаваў на карце, але ведаюць, што туды ездзіць прэзідэнт, а сюды прыязджаюць іх прадстаўнікі.

**Вы сцвярджаеце, што беларускае грамадства ніколі яшчэ не было так падзелена, і сённяшнюю сітуацыю можна параўнаць хіба што толькі з часам пасля II сусветнай вайны.**

Самюэль Ф.Ханцінгтан[1] нарысаваў лінію, якая праходзіць праз польска-беларускую мяжу з 1939 года. Бо існуе традыцыя дзвюх Беларусей. Адной — еўрапейскай, якая адказвае за сувязі з Захадам; выражэнне такога мыслення знаходзіць таксама адлюстраванне ў адносінах да дзяржавы, да Бога. Другая Беларусь адказвае за саюз з Расіяй, з'яўляецца еўраазіяцкай, чэрпае з візантыйскай культуры і мае іншыя рэлігійныя, палітычныя, культурныя традыцыі. У 1945 годзе гэтыя дзве Беларусі апынуліся ў межах адной дзяржавы. Падзел,

[1] Самюэль Філіп Ханцінгтан (нар. у 1927) — амерыканскі палітолаг і ўніверсітэцкі выкладчык, у 1977-87 гадах каардынатар па планаванні ў Радзе нацыянальнай бяспекі ЗША, 1986-87 — прэзідэнт Амерыканскага таварыства палітычных навук, галоўны рэдактар штомесячніка "Foreign Policy", дырэктар Цэнтра міжнародных стасункаў ім. Ёхана Оліна ў Гарвардскім ўніверсітэце.

які існаваў стагоддзямі, не атрымаецца сцерці пры дапамозе нейкай чароўнай гумкі.

Гэты разлом за апошнія гады ўзмацніла наша дзяржава. Лукашэнка свядома на ім гуляў і хацеў, каб ён быў усё больш выразным. Той частцы, якая выказалася за Лукашэнку, аддавалі перавагу, яна атрымлівала грошы, уладу, адукацыю, уплывы. А дэмакратычная Беларусь была адкінута. Дзяржава гэтых людзей нібыта не заўважае.

Вядома, цяпер, калі Лукашэнка бачыць выразную пагрозу з боку Расіі, стараецца гуляць картай нацыянальнай ідэі. Арганізуе канцэрты “За Беларусь”, адзначае дзяржаўныя святы. Але гэта ўсё на паверхні. Праз столькі гадоў палітыкі дэнацыяналізацыі шанс, што Лукашэнку ўдасца ўсё паправіць, мізэрны.

### Як выглядае беларуская сям’я? Ці таксама вельмі падзеленая?

Цывілізацыйны падзел у сэрцах людзей, таму і сем’і падзеленыя, а гэта нараджае канфлікты. Грамадства ў стрэсе. Старэйшыя людзі адчуваюць, што іх кінулі дзеці, дзеці — што іх не разумеюць бацькі. Большасць актыўных апазіцыянераў, журналістаў не змаглі ўтрымаць свае сем’і. Лідэры апазіцыі альбо жывуць без сям’і, альбо ўжо заснавалі другую. Гэта значыць, што іх палавінкі не хацелі ісці той самай дарогай, якую яны абралі.

### Ці можна казаць пра дэмаралізацыю беларускага грамадства?

Многія думаюць пра эміграцыю. Прыкладна адна трэцяя частка дарослага грамадства выехала б, калі б мела такую магчымасць. Сярод моладзі пра гэта марыць кожны другі апытаны. Мы адзначаем спад даверу да дзяржавы і да ўстаноў, таксама і недзяржаўных.

Але не трэба казаць пра дэмаралізацыю ўсяго грамадства. Мы маем справу з абыякавасцю. На пытанне: “Якія пачуцці ў Вас з’явіліся ў апошнія гады?” 28,8 працэнтаў называе надзею, а 24,8 працэнты — стомленасць. Гэтым людзям ужо ўсё роўна.

## Ці гэта прыкмета застою?

Калі гаворка ідзе пра гаспадарку, цяжка казаць пра застой. Канешне, наша эканоміка жывіцца з таннага расійскага газу і нафты. Заробкі цалкам высокія. Таму многія беларусы лічаць, што жыццё ўвогуле не такое і дрэннае. На пытанне "Як змянілася Ваша матэрыяльная сітуацыя за апошнія тры месяцы?" 15 працэнтаў адказвае, што паправілася, а дзве трэці апытаных сцвярджае, што нічога не змянілася. Пагаршэнне сітуацыі адзначылі каля 18 працэнтаў. Толькі кожны пяты беларус лічыць, што ў бліжэйшыя гады эканамічная сітуацыя пагоршыцца, кожны чацвёрты верыць у паляпшэнне, а рэшта перакананая, што сітуацыя не зменіцца.

Так, сёння Беларусь у канфлікце і з Расіяй, і з Захадам. Ёсць усё больш перадумоў, што можа наступіць крызіс, але калі гэта стане, невядома. Як гэты крызіс будзе праходзіць? Ці будуць нейкія раптоўныя выбухі, ці ўсё будзе ісці паволі? Цяжка сказаць. Я правёў бы аналогію з эпохай застою савецкіх часоў, гэта другая палова 70-х і пачатак 80-х гадоў. Фармальна тады яшчэ не было страшэнных чэргаў у крамах і прадуктаў па картках, але эканамісты ўжо білі трывогу. Аднак Брэжнеў не хацеў ніякіх змен. Калі прыняць гэтую аналогію і палічыць, што Беларусь зараз дзесьці ў 1979 годзе, то да аналагічнага 1991 года колькі нам засталося? Дванаццаць гадоў.